ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 13 (643) | Субота, 12 красавіка 1986 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## АГУЛЬНА-УНІВЕРСІТЭЦКІ ПАРТЫЙНЫ СХОД

Учора ў актавай зале адбыўся агульнауніверсітэцкі адкрыты партыйны сход. Па дакладу сакратара партыйнага камітэта М. І. Старавойтава абмеркавана пытанне «Вынікі XXVII з'езда КПСС і задачы партыйнай арганізацыі універсітэта па выкананню яго рашэнняў». Прынята адпаведная пастанова і зацверджаны арганізацыйна-палітычныя мерапрыемствы парткома па выкананню рашэнняў XXVII з'езда КПСС.

Справаздача аб партыйным сходзе будзе змешчана ў наступным нумары нашай газеты.

ПАЗЫЎНЫЯ «ЧЫРВОНАЙ СУБОТЫ»

## НА ДОБРАЎПАРАДКАВАННІ

З надыходам вясны студэнты ГДУ прыводзяць у парадак тэрыторыю, прылягаючую да карпусоў і інтэрнатаў універсітэта, студэнцкі парк. Звычайна гэтыя работы па добраўпарадкаванню і азеляненню праходзяць па распрацаваных загадзя на факультэтах графіках і прымяркоўваюцца да Усесаюзнага камуністычнага суботніка, прысвечанага чарговай гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна.

Арганізавана праходзіць работа па навядзенню парадку на універсітэцкай тэрыторыі на эканамічным факультэце. Тут склалі дакладны графік, з якім азнаёмлены студэнты, па выніках работы кожнай акадэмічнай групы выпускаюцца «маланкі». Ужо справіліся з дадзенымі заданнямі студэнты груп 0-11, Т-21, Т-22, Т-23, 0-21, 0-22, 0-31, 0-32, Т-41 і інш. Яны ўскапалі газоны каля галоўнага корпуса, прывялі ў парадак і пафарбавалі скульптурны помнік у студэнцкім парку, выканалі іншыя работы па ўборцы тэрыторыі.

Добрасумленная і ўдарная праца тых, хто вызначаецца стараннасцю, адзначаецца ў «маланках», якія вывешваюцца на дошцы аб'яў эканомфака. Так, адна з іх, за 8 красавіка называла прозвішчы студэнтаў групы Т-12 А. Маісеенкі, Г. Савасценка, В. Такарскай, А. Аніпка, С. Качалоўскай, С. Хулуп, Н. Чарашнёвай, А. Алесенка, якія ўдарна папрацавалі на ўборцы тэрыторыі парка. Тут жа былі названы і тыя, хто вызначыўся не з лепшага боку, самавольна пайшоў, не закончыўшы работу, або зусім не з'явіўся на яе. Гэта, зразумела, аказвае на недобрасумленных студэнтаў немалы выхаваўчы ўплыў.

У дзень Усесаюзнага камуністычнага суботніка, прысвечанага 116-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, студэнты эканамічнага факультэта будуць наводзіць чысціню і парадак у галоўным корпусе, яго аўдыторыях, лабараторыях.

(Наш кар.).

## *Ленінскія стыпендыяты — гордасць універсітэта*



Яркія праменьчыкі сонейка падаюць на стол, блукаюць па старонках кнігі, пераскокваюць на твар. Вясна... Тамара любіць гэтую пару года. Абнаўленне прыроды прыносіць у яе душу пачуцці радасці і ўзнёсласці. У гэты час ёй асабліва хочацца слухаць музыку. Яна заўсёды з ёй, нават цяпер, калі Тамара Міхалкіна ўжо не навучэнка Гомельскага музычнага вучылішча імя Н. Ф. Сакалоўскага, а трэцякурсніца гісторыка-філалагічнага факультэта ГДУ.

Чалавеку дадзены цудоўныя магчымасці і здольнасці — мадыць, ажыццяўляць задуманае. Першую сваю мару Тамара ўжо здзейсніла, другая — стаць настаўніцай — таксама абавязкова збудзецца. Т. Міхалкіна выдатна вучыцца на аддзяленні рускай мовы і літаратуры гістфіла. Толькі пяцёркі стаялі ў яе залікоўцы і тады, калі дзяўчына была студэнткай гэтай жа спецыяльнасці завочнага факультэта ГДУ. Пасля пераводу на стацыянар Тамара здолела даказаць правільнасць свайго выбару прафесіі. Яна настойліва авалодвае вучэбнай праграмай, актыўна займаецца навукова-даследчай работай. Даклады Тамары Міхалкінай па лінгвістыцы на факультэцкіх, рэспубліканскай канферэнцыях, яе поспехі на алімпіядах «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» адзначаліся граматамі і падзякамі. Дзяўчына добра валодае і замежнай моваю. На прайшоўшым нядаўна універсітэцкім конкурсе перакладчыкаў англійскай мовы яна заняла адно з прызавых месц.

За выдатную вучобу, актыўнасць у навуковай і грамадскай рабоце трэцякурсніцы гісторыка-філалагічнага факультэта Т. Міхалкінай назначана Ленінская стыпендыя.

Педагог з яе атрымаецца сапраўдны. Бо калі ў душы чалавека гучыць музыка, ён здольны на многае!

Т. ДУБЯК.

Фота Н. Кір'янавай.

*Навука — на службе пяцігодкі*

## ПАЛЕССЮ — БАГАЦЕЦЬ

Створанае на базе Гомельскага дзяржаўнага універсітэта вучэбна-навукова-вытворчае аб'яднанне «Фауна Палесся» набыло шырокую вядомасць і дасягнула ў сваёй практычнай дзейнасці значных поспехаў. Гэта яскрава праявілася на яго чарговай, чацвёртай па ліку, навуковай канферэнцыі «Жывёльны свет Беларускага Палесся, ахова і рацыянальнае выкарыстанне», якая на працягу трох дзён праходзіла ў ГДУ. У яе рабоце ўдзельнічала звыш 100 прадстаўнікоў навукі і вытворчасці, сярод якіх было 8 дактарҷў і каля 40 кандыдатаў навук з Беларусі, Украіны, Малдавіі, Літвы, некаторых абласцей Расійскай Федэрацыі.

На канферэнцыі падведзены вынікі работы за мінулы год і за XI пяцігодку ў цэлым, у святле рашэнняў XXVII з'езда КПСС вызначаны рубяжы на новы перыяд.

Асноўнай задачай ВНВА «Фауна Палесся» была распрацоўка метадычных асноў стварэння плана аховы, абагачэння і рацыянальнага выкарыстання жывёльнага свету Палесся ва ўмовах меліярацыі і сельскагаспадарчага асваення тэрыторыі. Па гэтай праблеме за мінулую пяцігодку членамі аб'яднання апублікавана каля 400 работ, у тым ліку 160 — вучонымі, выкладчыкамі, супрацоўнікамі і аспірантамі Гомельскага дзяржуніверсітэта.

Першы этап работы ў асноўным завершаны. Цяпер з мэтай паўнейшага выкарыстання і ўзнаўлення прыродных рэсурсаў і жывёльнага свету Палесся, іх пастуловага абагачэння будуць распрацоўвацца рэкамендацыі паасобна для кожнага або некалькіх з аднолькавымі ўмовамі раёнаў.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

*Юбілей савецкай касманаўтыкі*

## ПАКАРЫЦЕЛІ СУСВЕТУ

**У азнаменаванне першага ў свеце палёту чалавека ў Космас Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 9 красавіка 1962 года ўстаноўлены Дзень касманаўтыкі. Па рашэнню Міжнароднай федэрацыі ён адзначаецца як Сусветны дзень авіяцыі і касманаўтыкі.**

25 гадоў таму назад адбыўся гістарычны старт савецкага касмічнага карабля «Усход» з чалавекам на борце. За лічаныя мінуты першы касманаўт свету Ю. А. Гагарын абляцеў нашу планету. Тым самым быў пакладзены пачатак палётам чалавека ў касмічную прастору. Паспяховае вырашэнне многіх складанейшых навуковых і тэхнічных задач у асваенні космасу дазволіла савецкім касманаўтам першымі выйсці ў адкрыты космас, здзейсніць упершыню стыкоўку караблёў. СССР першым стварыў касмічныя апараты для вывучэння планет сонечнай сістэмы — лунаходы, «Венеры», «Марсы», першыя арбітальныя станцыі і комплексы, на борце якіх былі ажыццёўлены самыя працяглыя палёты.

Значны ўклад у развіццё практычнай дзейнасці чалавека ў космасе зроблены савецкімі вучонымі. Выкарыстанне касмічнай тэхнікі дазваляе па-новаму, з высокай эфектыўнасцю вырашаць многія задачы народнай гаспадаркі і навуковых даследаванняў. Спадарожнікі самага разнастайнага прызначэння працуюць на арбітах. Яны ажыццяўляюць радыё- і тэлесувязь, сочаць за надвор'ем, інфармуюць аб стане пасеваў, дапамагаюць экіпажам суднаў і самалётаў у навігацыйных вымярэннях.

Даследаванні космасу ў нашай краіне носяць выключна мірны характар. Савецкі Саюз пастаянна выступае за супрацоўніцтва ўсіх дзяржаў у асваенні Сусвету. Многія гады сацыялістычныя краіны дружна працуюць па праграме «Інтэркосмас». Наша краіна — адна з удзельніц міжнароднай сістэмы пошуку церпячых бедства судоў і самалётаў. Савецкія аўтаматычныя станцыі «Вега» пракладі шлях іншым касмічным апаратам да каметы Галея.

Савецкія касманаўты адны з заснавальнікаў Асацыяцыі ўдзельнікаў касмічных палётаў, галоўная мэта якой — барацьба супраць мілітарызацыі космасу.

Неагляднымя гарызонты дзейнасці людзей у мірным космасе. Савецкі Саюз заўсёды гатовы супрацоўнічаць з ЗША і іншымі краінамі. У той жа час СССР рашуча выступае супраць амерыканскай «стратэгічнай абароннай ініцыятывы», вядомай ва ўсім свеце, як праграма «зоркавых войн», вядучай да стварэння самазнішчальных сродкаў узбраення.

## ПРАЦУЕ ДЫСКУСІЙНЫ КЛУБ

Ва універсітэце пачаў сваю работу дыскусійны клуб. Першае яго пасяджэнне адбылося ў чацвер, 10 красавіка ў чытальнай зале інтэрната № 1.

Мэта і задачы новага клуба — даваць адказы студэнтам ГДУ на цікавячыя іх пытанні ўнутранага жыцця краіны, г. Гомеля, нашай ВНУ, асвятляць праблемы міжнародных адносін дзяржаў на сусветнай арэне і інш. Па самых разнастайных пытаннях перад студэнтамі будуць выступаць выкладчыкі, партыйныя, камсамольскія, гаспадарчыя работнікі ГДУ, а таксама прадстаўнікі партыйных і савецкіх органаў горада.

Кожнае пасяджэнне клуба будзе праходзіць у форме ажыўленай дыскусіі па хвалюючых студэнтаў ГДУ праблемах.

## НАВУКОВАМУ ПОШУКУ — ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

Сесія гадавога агульнага сходу Акадэміі навук Беларусі адбылася 10 красавіка ў Мінску. З дакладам аб задачах Акадэміі навук БССР у святле рашэнняў XXVII з'езда КПСС выступіў прэзідэнт АН БССР акадэмік М. А. Барысевіч.

Удзельнікі сходу прааналізавалі вынікі дзейнасці ўстаноў акадэміі ў 1985 годзе і за пяцігодку. Намечаны канкрэтныя меры па развіццю фундаментальных даследаванняў, павышэнню іх эфектыўнасці, паляпшэнню каардынацыі навуковай дзейнасці, умацаванню і расшырэнню супрацоўніцтва ўстаноў АН БССР з прамысловымі прадпрыемствамі, калгасамі і саўгасамі, НДІ і ВНУ рэспублікі і краіны.

У рабоце сесіі гадавога агульнага сходу прыняў удзел сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін.

(БЕЛТА).

# ПАЛЕССЮ—БАГАЦЕЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

На пленарным пасяджэнні канферэнцыі асноўныя вынікі работы ВНВА «Фауна Палесся» падвёў загадчык кафедры заалогіі і аховы прыроды ГДУ, старшыня прэзідыума савета аб'яднання прафесар Б. П. Савіцкі. Ён жа гаварыў аб задачах на XII пяцігодку.

Заслуханы таксама даклады: кандыдатаў біялагічных навук (Мінск) С. В. Ячэня «Структура энтамафауны аграцэноза зерневых культур у Беларусі», Д. Ф. Куніцкага «Умовы і асаблівасці размнажэння рыб ракі Прыпяці», доктара медыцынскіх навук В. Л Адамовіча з Бранска «Да пытання прагназіравання лакальных і масавых размнажэнняў мышападобных грызуноў і сувязь гэтай з'явы з геліяцыклікай», кандыдата біялагічных навук В. М. Верамеева (ГДУ) «Біялагічная актыўнасць глебы, якая падтапляецца і затапляецца ў раёне гідратэхнічных збудаванняў».

На канферэнцыі працавала 4 секцыі, адбыліся сімпозіумы і дыскусіі «Круглага стала». Па пытаннях распрацоўваемай праблемы заслуханы і па-дзелавому абмеркаваны дзесяткі навуковых паведамленняў і выступленняў што будзе садзейнічаць больш паспяховаму ажыццяўленню задач, якія стаяць цяпер перад аб'яднаннем «Фауна Палесся».

Б. ВАЛОДЗІН.



**НА ЗДЫМКУ: (злева направа) удзельнікі навуковай канферэнцыі «Жывёльны свет Беларускага Палесся, ахова і рацыянальнае выкарыстанне»: старшыня секцыі аховы жывёльнага свету Украінскай ССР дацэнт кафедры заалогіі Кіеўскага педінстытута В. Р. Надворны, выкладчыца заалогіі Віцебскага педагагічнага інстытута С. П. Каханская і загадчык кафедры заалогіі педінстытута г. Умані А. К. Ткачэнка.**

Фота Н. Кір'янавай.

*Насустрач працоўнаму семестру-86*

## ВУЧОБА ЗАВЯРШЫЛАСЯ

Актыўна рыхтуюцца да чарговага працоўнага лета студэнцкія атрады ГДУ. Паспяхова выконваюцца прынятыя на падрыхтоўчы перыяд сацыялістычныя абавязацельствы. У сакавіку прайшла вучоба камандзіраў студэнцкіх атрадаў. З лекцыямі аб вытворчай, грамадска-палітычнай дзейнасці СБА, іх медыка-санітарным забеспячэнні перад кіраўнікамі атрадаў выступілі вопытныя камандзіры і камісары ГДУ.

У пачатку бягучага месяца прайшла абласная вучоба камандзіраў і камісараў студэнцкіх атрадаў. Яе праводзілі работнікі абласнога штаба СБА, урачы санэпідстанцыі.

У гэтыя дні па графіку тэхнічныя інспектары прымаюць у атрадах экзамены па прачытанаму курсу «Ахова працы ў СБА», байцы праходзяць медыцынскі агляд.

## МЕСЦЫ ПРАЦЫ ВЫЗНАЧАНЫ

Як і ў папярэднія гады, шырокай будзе геаграфія сёлетняга працоўнага семестра-86. Цяпер ва універсітэце пачалася дагаворная кампанія.

Гэтым летам студэнтаў ГДУ — байцоў атрадаў самых розных напрамкаў дзейнасці — будуць чакаць у калгасах і саўгасах Гомельскай вобласці, на цагельным заводзе і льнозаводзе, у будаўнічых арганізацыях. Паедуць будатрады за межы рэспублікі — у Пскоўскую, Цюменьскую вобласці, у Карэльскую АССР. Дзяўчаты апрануць форму праваднiц чыгуначных вагонаў, працюардэс, стануць на час працоўнага семестра нянечкамі ў Гомельскім доме дзіцяці.

На базе эканамічнага факультэта фарміруецца інтэрнацыянальны атрад «Дружба-86», які выедзе ў горад-пабрацім ЧССР Чэске-Будзеёвіцэ. Будучыя ж матэматыкі рыхтуюцца прыняць чэшскіх сяброў на гомельскай зямлі.

*Твой вольны час*

# ...НА ТОЕ І СТУДЭНЦКІЯ ГАДЫ

Добра вучыцца і адпачываць, калі цябе акружаюць цікавыя, творчыя людзі. Тады на душы заўсёды лёгка і радасна. Для таго, каб так было, трэба самому быць чулым чалавекам, дарыць людзям дабрату і настрой. Жыць, не шкадуючы сябе, не ўтойваць ад іншых усё, што ведаеш і ўмееш,— такіх поглядаў прытрымліваюцца студэнты нашай групы М-23 матэматычнага факультэта. Амаль кожнае свята мы адзначаем разам. Любая наша сустрэча праходзіць вельмі цікава і захапляюча.

Зусім нядаўна ў нашай групе быў створан клуб «Што? Дзе? Калі?». 1-га красавіка адбылося першае яго пасяджэнне. Кіруе ім С. Міхайлава, якая з'явілася галоўным ініцыятарам яго стварэння. У клуб уваходзяць тры каманды па 6 чалавек.

Першая гульня адбылася, цяпер можна падвесці некаторыя яе вынікі. Яна праходзіла на дастаткова высокім узроўні. А перад самой гульнёй удзельнікі клуба «Што? Дзе? Калі?» прынялі статут і клятву.

Шмат уражанняў засталося ў кожнага з нас пасля першай гульні. Нельга сказаць, што гэта была толькі гульня ў чыстым выглядзе, якая патрабавала пэўных ведаў, здольнасцей. Тут кожны мог паказаць не толькі свае добрыя веды, але і знаходлівасць, уменне сканцэнтраваць увагу на пытанні. Такія мерапрыемствы карысныя перш за ўсё ў пазнавальных адносінах, а праведзены такім чынам вольны час надоўга застаецца ў памяці.

Былі і музычныя паўзы — нумары мастацкай самадзейнасці студэнтаў групы. Гучалі песні, вершы, ставіліся гумарыстычныя сцэнкі. Асабліва спадабаліся ўсім выступленні І. Арлова, С. Касаевай, Л. Шкуратавай, І. Козыравай.

Пасля конкурсу ўсе пілі чай, абмяркоўвалі розныя справы групы. Панаваў вясёлы настрой, свяціліся ўсмешкамі твары. Але ,як кажуць, лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць. Таму мы будзем вельмі рады гасцям на наступным пасяджэнні нашага клуба. Гульні будуць праводзіцца штомесячна, І наступная адбудзецца ў пачатку мая.

На нашу думку, такія ж клубы можна было б стварыць у любой акадэмічнай групе не толькі матфака, але і універсітэта. Усё залежыць ад нас саміх, ад таго, як мы зможам ажыццяўляць на справе свае ідэі і задумы. Не трэба баяцца спрабаваць, шукаць, эксперыментаваць. На гэта і дадзены маладому чалавеку пяць студэнцкіх гадоў.

Студэнты нашай групы пераканаліся: няма людзей нецікавых, у кожным чалавеку можна адкрываць здольнасці, талент.

Хочацца выказаць падзяку ўсім, хто прыняў актыўны ўдзел у арганізацыі клуба «Што? Дзе? Калі?: С. Міхайлавай, З. Школьнік, Н. Лісковіч, К. Бутырынай, Г. Скапцовай.

Спадзяемся, што ва універсітэце знойдуцца студэнты, якія захочуць прыйсці ў наш клуб, або стварыць такі ж на сваім факультэце.

**Л. ЦІТАРЭНКА,**
**студэнтка гр. М-23 матфака, слухачка аддзялення журналістыкі факультэта грамадскіх прафесій.**

*Прафарыентацыя*

## СЁННЯ—ШКОЛЬНІК, ЗАЎТРА—СТУДЭНТ

На другім курсе эканамічнага факультэта студэнтам чытаюць курс лекцый «Псіхолага-фізіялагічныя асновы арганізацыі працоўнага працэсу». Яго выкладае кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт І. В. Хадалевіч. Яе лекцыі заўсёды цікавыя.

У першым семестры па названай дысцыпліне намі была вывучана тэма «Прафарыентацыя і прафадбор». Тады Ірына Васільеўна прапанавала студэнтам нашага курса выступіць з адпаведнай гутаркай у адной са школ горада.

І вось мы ў СШ № 16. Тут сустрэліся на шостым уроку з дзесяцікласнікамі. Адразу ж адчулі іх добразычлівасць, зацікаўленасць. Таму хацелася як мага больш расказаць рабятам. Я, у прыватнасці, гаварыла аб новых правілах прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, Надзя Туманава — пра універсітэт, Таня Окрут — пра яго эканамічны факультэт.

Нас некалькі здзівіла, што дзесяцікласнікі, якія ўжо стаяць перад самастойным выбарам дарогі ў жыццё, яшчэ амаль не знаёмы з новымі правіламі прыёму ў ВНУ. Таму пытанняў ад іх было вельмі шмат. Гэта — па якой сістэме будзе праводзіцца прафадбор? Які вышэйшы бал субяседвання? Каму будзе аддавацца перавага пры залічэнні? і г. д.

Некаторых цікавіла маючая адбыцца перабудова вышэйшай школы.

Разам з тым хочацца звярнуць увагу на тое, што многія дзесяцікласнікі вельмі мала ведаюць пра наш універсітэт, яго факультэты, хаця іх школа знаходзіцца побач з ГДУ. Значыць, у плане прафарыентацыі мы некалькі не дапрацоўваем.

Пры сустрэчы вучні распытвалі пра культурна-масавую работу, праводзімыя ва універсітэце конкурсы і іншыя мерапрыемствы. Гэта сведчыць аб тым, што пэўная цікавасць да вядучай вышэйшай навучальнай установы Беларускага Палесся ў школьнікаў ёсць. Аднак яна павінна павышацца. На гэта трэба накіраваць больш эфектыўную прафарыентацыйную работу не толькі выкладчыкаў, але і нас, студэнтаў.

**А. БАЛОГА,**
**студэнтка 2-га курса эканамічнага факультэта.**

*1986 год — Міжнародны год міру*

# БЕССМЯРОТНАЯ СПАДЧЫНА

Барацьба за мір і мірнае суіснаванне дзяржаў з розным сацыяльным ладам — адна з важнейшых задач нашага часу. У ёй выказаны агульныя інтарэсы розных краін і народаў.

Як вядома, войны з'яўляюцца парадзжэннем пэўных сацыяльна-эканамічных умоў. «Вайна, — падкрэсліваў У. І. Ленін, — ёсць працяг палітыкі іншымі сродамі...».

Непазбежныя вынікі войн— гібель і пакуты людзей, знішчэнне матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей. Менавіта таму праблема вайны і міру хвалявала розумы і сэрцы людзей на працягу ўсёй гісторыі чалавецтва.

Антымілітарызм зарадзіўся ў глыбокай старажытнасці. Новы імпульс ён атрымлівае ў сярэднія стагоддзі і асабліва ў эпоху Адраджэння. Гэта было звязана з найвялікшай культурнай місіяй гуманізму, дзейнасцю плеяды буйнейшых мысліцеляў, вучоных, публіцыстаў, у ліку якіх быў і Эразм Ратэрдамскі, з дня смерці якога сёлета спаўняецца 450 гадоў.

Нарадзіўся Дэзідэрый Эразм у 1466 (або 1469) годзе ў галандскім горадзе Ратэрдаме. Ужо з дзіцячых гадоў ён далучыўся да антычнай культуры, якой з такім энтузіязмам займаліся гуманісты. Паступова з працалюбівага школяра Эразм з гадамі ператварыўся ў аднаго з самых культурных людзей Еўропы, у буйнейшага знаўцу грэчаскай і лацінскай моў І наогул усёй антычнай славеснасці. Важна адзначыць тую акалічнасць, што свае шырокія веды аб свеце ён чэрпаў не толькі з фаліянтаў, але і непасрэдна з самога жыцця.

Эразм бачыў, як далёка адышоў свет ад маральнага ідэалу і не хацеў заставацца абыякавым сведкай чалавечых памылак. Не раз уздымаў ён свой голас супраць таго, што здавалася яму неразумным, уродлівым, сваёй вострай сатырай ён злосна бічаваў невуцтва, злосць, сквапнасць, недаваў літасці афіцыяльнаму багаслоўю. І можна з упэўненасцю сказаць, што ў пачатку XVI ст. не было ў Еўропе другога такога мысліцеля і публіцыста, які б карыстаўся большай вядомасцю і ўплывам. Ён быў уладаром дум, яго публіцыстыка выдавалалася значнымі для таго часу тыражамі.

Перагортваючы старонкі кніг Эразма Ратэрдамскага, немагчыма не звярнуць увагу на надзвычайную канкрэтнасць і рэалістычнасць у разглядзе пастаўленых ім некаторых палітычных задач дзяржаўнага кіравання. Але, бадай, самае важнае і актуальнае ў яго публіцыстычнай дзейнасці — гэта пастаноўка важнейшых знешнепалітычных праблем і прапаноўваемыя ім рашэнні.

У чым жа заключаюцца ідэі вялікага гуманіста, якія актуальныя і сёння, на рубяжы трэцяга тысячагоддзя? Злабадзённасць яго ідэй — у адносінах да пытання аб вайне і міру, у антываеннай прапагандзе. Яго рэзка адмоўныя адносіны да вайны, якія спалучаюцца з дыферанцыраваным падыходам да розных катэгорый войн, а таксама рэкамендацыі мірных шляхоў рашэння міжнародных спрэчак — агульнавядомыя. Ён пісаў аб тым, што неабходна кіравацца ідэяй служэння ўсіх прыватных інтарэсаў — агульнадзяржаўным у перыяд рашэння вострых знешнепалітычных спрэчак. Для таго, каб паміж асобнымі дзяржавамі не было канфліктаў, трэба прытрымлівацца прынцыпа добрай волі, сцвярджаў Эразм Ратэрдамскі.

Выказваючы свае адносіны да вайны, як да ўсеагульнай бяды, выдатны гуманіст пісаў: «...Вайна — вядзецца дармаедамі-забойцамі, падонкамі грамадства з мэтай нажывы, але далёка не адукаванымі філасофамі». Антываенныя ідэі ён выказвае ў многіх работах, з якіх можна вылучыць «Скаргу свету» і «Пахвальнае слова глупству». Спачатку Эразм разглядае, што такое вайна і мір у цэлым. Ён малюе карціны матэрыяльнага і духоўнага росквіту, які можа даць людзям мір. Вялікі гуманіст пісаў: «Нялёгка адважыцца на вайну той, хто мае на ўвазе толькі інтарэсы грамадства. Наадварот, ...усе прычыны войн узнікаюць з таго, што не мае ніякіх адносін да народа...».

Больш 450 гадоў таму назад былі выказаны гэтыя ідэі. Але яны перажылі стагоддзі. У наш час, калі войны набылі не мясцовы, а ўсеагульны характар і пагражаюць чалавецтву пагібеллю, народы розных краін робяць усё магчымае, каб іх папярэдзіць. І абвяшчэнне 1986 года годам Міру стане важным этапам у справе барацьбы за мір, умацавання камуністычнага, рабочага і нацыянальна-вызваленчага руху на планеце.

**С. ЛЫСЕНКА,**
**студэнт гр. Г-21 гісторыка-філалагічнага факультэта.**

*Конкурсы*

## ПЕРАКЛАДАЕМ З АНГЛІЙСКАЙ

Ва універсітэце прайшоў стаўшы ўжо традыцыйным конкурс перакладчыкаў. У ім прынялі ўдзел 19 студэнтаў пяці факультэтаў ГДУ.

Удзельнікам было прапанавана выканаць пісьмовы пераклад тэксту па тэме «Міралюбівая палітыка СССР».

Кампетэнтнае журы ў саставе выкладчыкаў кафедры англійскай мовы Г. Т. Ільіч, Л. С. Пагудзінай выявіла пераможцаў. Лепшымі перакладчыкамі па праву прызнаны студэнтка групы 0-42 эканамічнага факультэта Т. Гільяшэнка, якая заняла першае месца, другакурснік біяфака Э. Цуранкоў і студэнтка групы Р-31 гістфіла Т. Міхалкіна. Яны занялі адпаведна другое і трэцяе месцы. Пераможцы прымуць удзел у агульнагарадскім конкурсе перакладчыкаў, які адбудзецца 22 красавіка ў нашым універсітэце.

Кафедра англійскай мовы выказвае падзяку ўдзельнікам і арганізатарам конкурсу, запрашае ўсіх жадаючых прыняць удзел ва універсітэцкім конкурсе перакладчыкаў у сакавіку наступнага года.

**І. МІКУЛІЧ,**
**выкладчыца кафедры англійскай мовы.**

***Пошук вядуць археолагі***

# ПРА ШТО РАСКАЖУЦЬ ЗНАХОДКІ

Паводле даных чарговага тома «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» на тэрыторыі нашай вобласці налічваецца звыш 550 археалагічных помнікаў. Самыя старажытныя з іх адносяцца да перыяду 27—22 тысяч гадоў таму назад. Велізарная колькасць стаянак, селішчаў, магільнікаў, гарадзішчаў і рэштак летапісных гарадоў...

Летам мінулага года аб'яднаная археалагічная экспедыцыя Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР і Гомельскага дзяржаўнага універсітэта зноў правяла даследаванні на рэштках сярэдневяковых пасяленняў і курганным магільніку каля вёскі Нісімкавічы ў Чачэрскім раёне. Цікавасць археолагаў да маляўнічых берагоў ракі Покаць выклікана багаццем у гэтых месцах помнікаў старажытнасці.

Новыя раскопкі праведзены на трох пасяленнях, памечаных у палявых дзённіках археолагаў пад нумарамі 2, 3 і 5. Селішча № 2 адносіцца да 5—10 стагоддзяў нашай эры. Тут даследаваны рэшткі двух паглыбленых у мацерыковы пясок пабудоў гаспадарчага прызначэння. Збудаванні мелі авальную ў плане форму і ўтрымлівалі вялікую колькасць разбітых у старажытнасці гліняных сасудаў, прызначаных для прыгатавання стравы і захоўвання прыпасаў. Сярод чарапкоў знойдзены косці буйной рагатай жывёлы, гліняныя праслічкі (насадкі для верацён), абломак бронзавага пярсцёнка і жалезныя нажы.

З пласта селішча ўдзельнікамі раскопак — вучнямі Нісімкавіцкай школы і студэнтамі-гісторыкамі ГДУ — здабыты абломкі ганчарных сасудаў 10-га стагоддзя, гліняныя і каменныя праслiцы, частка якіх упрыгожана арнаментам, нажы з рэшткамі драўляных рукаяжэнні, тачыльныя брускі, касцяныя праколкі. У гаспадарчых ямах знойдзены косці і луска рыб, якія раскажуць спецыялістам многа цікавага аб відавым саставе старажытнай рачной фауны і харчовым рацыёне славян, што жылі тысячу гадоў назад.

Некаторыя знаходкі — рэдкія. Першай знаходкай у арэале рассялення летапіснага племені радзімічаў аказалася складная жалезная брытва. Здзіўленне выклікаў загадкавы прадмет у форме паўмесяца, вылеплены з гліны. На яго правай паверхні — тры рады акуратных паглыбленняў, якія ўтвараюць своеасаблівыя кропачныя ланцужкі. Ёсць меркаванне, што ў рукі археолагаў трапіў каляндар 10 стагоддзя, які дапамагаў радзімічам «планаваць» сезон сельскагаспадарчых работ. Упершыню за тры гады раскопак на Нісімкавіцкіх селішчах знойдзены спецыяльныя мініяцюрныя сасуды з глінай—тыглі для плаўкі каляровых металаў.

Селішча № 3, адкрытае каля маладога лесу ва ўрочышчы Белая Круча, да пачатку раскопак здавалася звычайным участкам абрывістага берага Покаці. Але першы ж раскоп пацвердзіў здагадку, што і тут скрываюцца рэшткі сярэдневяковай вёскі. На невялікай глыбіні ўскрыты сляды згарэўшага паўземлянога жылля квадратнай у плане формы — 5—7 стагоддзяў нашай эры. Сцены пабудовы былі рублены з нятоўстых бярвенняў, а падлогай служыў добра ўтрамбаваны пясок. Ацяплялася жыллё, хутчэй за ўсё, не печчу, а адкрытым ачагом. Дах дома падтрымліваў драўляны слуп, укапаны пасярод пабудовы. Акрамя глінянай пасуды і прасліц, у жыллі знойдзены старажытнейшыя мукамольныя жарнавы — каменныя зерняцёркі. У гаспадарчай яме канца 10 —пачатку 11 стагоддзяў сабраны россыпы ганчарных чарапкоў, косці дзікіх і дамашніх жывёл, рыбіна луска. Тут жа была цэлая калекцыя прадметаў славянскага ўбору. Гэта дзве металічныя фібулы (засцёжкі для адзення) падковападобнай формы, падвескі ў выглядзе «шумячых» званочкаў, пацеркі, абломак шклянога пярсцёнка. Цікавая раменная накладка, выкананая з тонкага ліста бронзы. Пасля яе ачысткі ад зямлі яскрава праступіў стылізаваны арнамент у выглядзе кветкі. Магчыма, гэты выраб трапіў у Нісімкавічы з рамеснай майстэрні старажытнага Кіева або Чарнігава, дзе на бронзавых і сярэбраных упрыгажэннях часта сустракаецца падобнае адлюстраванне. Своеасаблівая падвеска «пятлістай» формы дапамагла вызначыць племянную прыналежнасць жыхароў селішча № 3 — такія ўпрыгажэнні насілі толькі жанчыны племені радзімічаў.

На селішчы № 5 ля падножжа велічнага гарадзішча «Курган» знаходак было мала. Але менавіта тут раскрыты сляды пасёлка першай палавіны і сярэдзіны I тысячагоддзя нашай эры. Паверхня знойдзеных гліняных сасудаў вызначаецца своеасаблівай «штрыхоўкай» — старажытныя ганчары, следуючы традыцыі, старанна выгладжвалі яшчэ сырую гліну пучкамі травы і грабёнкамі. У эпоху Кіеўскай Русі на гэтым месцы славяне насыпалі курганы. Нісімкавіцкія легенды памылкова звязваюць іх з пахаваннямі іншаземных воінаў 17—19 стагоддзяў (палякаў, турак, шведаў або французаў). У даследаваным археолагамі кургане аказалася пахаванне мясцовага селяніна, які жыў у канцы 11 — пачатку 12 стагоддзяў.

**А. МАКУШНІКАЎ,**
**малодшы навуковы супрацоўнік абласнога краязнаўчага музея, выпускнік ГДУ.**




**ТЭХНІЧНЫЯ СРОДКІ — У ВУЧЭБНЫ ПРАЦЭС**

# ПАМОЧНІКІ ВЫКЛАДЧЫКА

ЦЯПЕР у вучэбным працэсе шырока прымяняецца тэхніка. Своеасаблівы працэс індустрыялізацыі адукацыі, выклікаць навукова-тэхнічнай рэвалюцыяй, патрабаваў перагляду традыцыйных форм навучання з мэтай павышэння эфектыўнасці і якасці падрыхтоўкі спецыялістаў на аснове комплексна-мэтавага прымянення ТСН і новых метадаў. Тэхнічныя сродкі перадачы інфармацыі дазваляюць больш эфектыўна выкарыстоўваць такія дыдактычныя прынцыпы, як нагляднасць і даступнасць навучання. Па даных ЮНЕСКА вядома, што 83% людзей атрымліваюць інфармацыю праз зрок. Эксперыментальна даказана, што пры вусным выкладанні вучэбнага матэрыялу абучаемы за пэўны прамежак часу ўспрымае і здольны перапрацаваць да адной тысячы ўмоўных адзінак інфармацыі, а пры падключэнні да ўспрымання органаў зроку — каля 100 тысяч. Хаця паняцце перапрацоўкі ўмоўных адзінак інфармацыі ў многім спрэчнае і адноснае, тым не менш даказана, што абучаемы ўспрымае каля 80% інфармацыі.

К. Д. Ушынскі ўказваў на важнасць зрокавых успрыняццяў у вучэбным працэсе. Ён адзначаў, што ў нашай памяці захоўваюцца з асаблівай трываласцю тыя вобразы, якія мы ўспрымаем у працэсе зрокавага сузірання. Тэхнічныя сродкі перадачы інфармацыі з'яўляюцца незаменным сродкам у развіцці ўяўлення, прасторавага, візуальнага мыслення абучаемых. Як паказалі даследаванні савецкіх псіхолагаў, значэнне візуальнай культуры аказваецца не менш важным, чым культуры моўнай. Асабліва важна фарміраваць у студэнта з дапамогай тэхнічных сродкаў інфармацыі здольнасць да прамых і зваротных пераходаў ад мадэлі да арыгінала. Зрокавы вобраз незвычайна ёмкі, таму што ў ім адначасова адлюстроўваецца інфармацыя аб каляровых, прасторавых, дынамічных і фігуратыўных характарыстыках прадмета. Механізмы, якія параджаюць вобразы, носяць у псіхалогіі назву «візуальнае мысленне» і ўяўляюць сабой чалавечую дзейнасць, прадуктам якой з'яўляецца параджэнне новых вобразаў, стварэнне новых візуальных форм, якія нясуць пэўную сэнсавую нагрузку і робяць значэнне бачным.

Прымяненне ТСН стварае дадатковыя ўмовы для самастойнай работы над прадметам, садзейнічае развіццю цікавасці студэнтаў да прадмета, дазваляе некалькі паскорыць тэмп выкладання новага матэрыялу.

**У. ЧЫСЦІК,**
**загадчык лабараторыі тэхнічных сродкаў навучання.**

# НІ ГАЛОСНАСЦІ, НІ ЎЗНАГАРОД

Спартклуб і кафедра фізічнага выхавання ГДУ па праву лічацца запявaламі многіх карысных пачынанняў у нашым горадзе, вобласці, рэспубліцы. Адным з іх стала спартакіяда «Здароўе» сярод выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта, якая праводзіцца ўжо на працягу многіх гадоў. Для гэтага ёсць усё неабходнае: інвентар, спартыўныя збудаванні, кваліфікаваныя трэнеры і суддзі.

Цяпер вельмі важна, як адзначалася на XXVII з'ездзе КПСС, трымаць курс на развіццё масавай фізічнай культуры і спорту. Менавіта спартакіяда «Здароўе» з'яўляецца аглядам сіл розных факультэтаў. У яе праграму ўваходзіць 8 найбольш папулярных відаў спорту.

Па выніках мінулага года пераможцам спартакіяды стаў фізічны факультэт (адказны арганізатар В. Торап). Фізікі атрымалі камандныя перамогі ў такіх відах як стральба, плаванне, лыжы і былі другімі ў спаборніцтвах па шахматах і зімоваму мнагабор'ю ГПА. Найбольш важкі ўклад у перамогу ўнеслі С. Васільеў, М. Салавей, У. Семянчук, М. Капшай.

Аднак увагу я хачу звярнуць на такую акалічнасць. Правядзенне спартакіяды «Здароўе» жадае быць значна лепшым. На жаль, у апошнія гады чамусьці не праводзіцца ўзнагароджванне пераможцаў у асабістым і камандным заліках па кожнаму віду.

Зразумела, людзі займаюцца спортам не дзеля ўзнагарод, а перш за ўсё для таго, каб умацоўваць сваё здароўе. Аднак спаборніцтвы любога рангу павінны, як правіла, заканчвацца падвядзеннем вынікаў, якія неабходна своечасова апавяшчаць. Думаецца, кожнаму іх удзельніку цікава ведаць зыход барацьбы за асабістую і камандную перамогу, свой уклад у скарбонку набраных камандай ачкоў.

Акрамя таго, на кожным факультэце карысна зрабіць стэнд для ілюстрацыі спартыўных дасягненняў як студэнтаў, так і выкладчыкаў. Наглядная агітацыя за здароўе дазволіць павялічыць колькасць тых, хто пастаянна займаецца фізкультурай і спортам, пакажа твар кожнага факультэта ў барацьбе за здаровы быт.

**В. ЗАЛАТАРЭНКА,**
**адказны за спартыўны сектар прафбюро фізічнага факультэта.**

# ЛІТАРАТУРНЫ КАНЦЭРТ

У чацвер у актавую залу універсітэта прыйшлі аматары паэзіі. Тут адбыўся літаратурны канцэрт, на якім выступіла артыстка Масканцэрта Наталля Суравегіна.

Са сцэны пранікнёна гучалі паэтычныя радкі Андрэя Вазнясенскага, Марыны Цвятаевай, Юрыя Левітанскага, іншых рускіх і савецкіх паэтаў.

*Рэпліка*

## НЕ З'ЯВІЛІСЯ... АРГАНІЗАТАРЫ

Добрай традыцыяй у ГДУ з'яўляецца правядзенне Дзён факультэтаў. У прыватнасці, 5 і 6 красавіка планаваліся Дні геолага. Загад па універсітэту па правядзенню гэтага мерапрыемства падпісала нямала адказных асоб: нам. дэкана геалагічнага факультэта, адказныя за правядзенне вечароў В. П. Хайнак і загадчык лабараторыі У. М. Шырукаў. Толькі хочацца задаць пытанне: навошта пісаць загады, якія не выконваюцца? І хто за гэта павінен несці адказнасць? Можа старшыня аргкамітэта па правядзенню Дзён геолага студэнт гр. Г-21 Ігар Снягур або адказная за культурна-масавую работу на факультэце Святлана Бабыр? А можа студэнты 1—2 курсаў і дружыннікі геафака разам з В. П. Хайнаком і У. М. Шырукавым, якія наогул не з'явіліся 6 красавіка на правядзенне вячэрніх мерапрыемстваў і ў выніку чаго ўсім, хто прыйшоў з запрашальнымі білетамі, давялося пайсці ні з чым, таму што вечар быў сарваны?

Крыўдна, і зусім недапушчальна, каб добрыя традыцыі забываліся з-за безадказнасці некаторых таварышаў.

# ВАШ АДПАЧЫНАК

**Сёння:** Дні матэматычнага факультэта. КВЗ. Танцавальная праграма. Актавая зала. Пачатак — 18.

**Заўтра:** Канцэрт аркестра народных інструментаў пад кіраўніцтвам Ю. Адзінцова. Выстаўка-продаж мастацкай літаратуры. Палац культуры будаўнікоў. Пачатак — 12.

Справаздачны канцэрт матфака. Танцавальная праграма. Актавая зала. Пачатак — 18.

Заняткі сямейнага спартыўнага клуба. Спартыўная зала. Пачатак — 14. 16—19 гадзін. Заняткі групы «Здароўе». 19—21 — трэніровачныя заняткі секцый па ручному мячу пры падшэфных домакіраўніцтвах.

**На наступным тыдні:** 13—15 красавіка. Канцэрты артыстаў Кіеўскага мюзік-хола. Палац культуры і тэхнікі чыгуначнікаў імя У. І. Леніна. Пачатак — 18.30, 21.15.

15 красавіка. Дэманстрацыя мастацкага фільма «У адным маленькім горадзе». Актавая зала ГДУ. Пачатак — 19.30.

19—20 красавіка: канцэрты ансамбля «Райко» (ВНР). Палац культуры будаўнікоў. Пачатак—17, 19.30.

# ЗАПРАШАЕМ У ПАДАРОЖЖА

**Для студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта ёсць 18 пуцёвак у Сацыялістычную Рэспубліку Румынію з 29 ліпеня (на 14 дзён з адпачынкам). Кошт пуцёўкі — 300 рублёў.**

**ПРАФКОМ, ПРАФКОМ СТУДЭНТАЎ ГДУ.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

АЗ 43224 «Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.
Заказ 278